Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (142), 2024

УДК 94(476) “1921–1939” EDN: ARZIIS

# Структура памешчыцкага землеўладання на Палессі ў 1921–1939 гг.

В.П. Гарматны

У артыкуле разглядаецца памешчыцкае землеўладанне на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг., становішча памешчыкаў як асобнай сацыяльнай групы і яе галоўныя складнікі, узровень матэрыльнага дабрабыту і ўзаемаадносіны з іншымі сацыяльнымі групамі.
**Ключавыя словы:** памешчык, Палессе, сацыяльная структура, землеўладанне.

The article examines land ownership in the territory of the Polesie Voivodeship in 1921–1939, the position of landowners as a separate social group and its main components, the level of material well-being and relations with other social groups.
**Keywords:** landowner, Polesie, social structure, land ownership.

**Уводзіны.** На працягу 1921–1939 гг. Брэстчына ўваходзіла ў склад міжваеннай Польскай дзяржавы і ў асноўным супадала з тэрыторыяй Палескага ваяводства. У гэты перыяд Палессе надзвычай выразна характарызавалася як сельскагаспадарчы рэгіён з захаваннем празмернай колькасці памешчыцкага землеўладання, што расцэньвалася як відавочны перажытак з часоў паншчыны [1, с. 177–178], [2, с. 108]. Большую частку мясцовага насельніцтва складалі мала- і беззямельныя сяляне, якія востра пакутавалі ад зямельнага голаду і спадзяваліся атрымаць памешчыцкія ўгоддзі па самым нізкім кошце альбо навогул бясплатна [3, с. 163], [4, с. 140].

**Агляд гістарыяграфіі і крыніц.** У айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду памешчыцкае землеўладанне на Палессі, як і ва ўсёй Заходняй Беларусі міжваеннага часу, ацэньвалася рэзка негатыўна, падкрэслівалася ў першую чаргу роля памешчыкаў як эксплуататараў навакольнага сялянства, аб чым, напрыклад, красамоўна сведчыць назва працы аднаго з найбольш вядомых тагачасных даследчыкаў заходнебеларускай праблематыкі міжваеннага перыяду А.М. Мацко [5]. Сярод такіх выданняў у першую чаргу можна якасна вылучыць працу А.А. Сарокіна, у якой у адпаведнасці марксісцка-ленінскім падыходамі грунтоўна прааналізавана аграрнае пытанне на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., паказана становішча асноўных сацыяльных груп, прааналізаваны перадумовы сялянскага руху, у тым ліку і ўзаемаадносіны з памешчыкамі [6]. У гэткім жа рэчышчы выкананы таксама і манаграфіі Б.Я. Кухарава [7] і І.В. Палуяна [8], дзе вялікая ўвага нададзена палітыцы польскіх уладаў па падтрымцы памешчыкаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Палесся як яе часткі.

У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі праблемамі памешчыцкага землеўладання на Палессі займалася В.М. Папко [9], якая прысвяціла асобную кнігу арганізацыі гаспадарання ў маёнтках роду Дзяконскіх, які хоць і не быў на той час самым заможным і уплывовым, але пакінуў значны след у сацыяльна-эканамічным развіцці Пружаншчыны і Кобрыншчыны.

В.С. Місіюк паказаў трансфармацыю памешчыкаў Заходняй Беларусі (і ў тым ліку Палесся) ва ўмовах цывілізацыйных змен і намаганні своечасова рэагаваць на іх выклікі [10].

Агульнае сацыяльна-эканамічнае становішча Палескага ваяводства ў складзе міжваеннай Польшчы, палітыка дзяржаўных уладаў і асноўныя падыходы да вырашэння галоўных мясцовых праблем (перш за ўсё аграрнай), стан даследавання рэгіёну ў цэлым прааналізаваны ў навуковых працах А.Г. Цымбала і І.С. Чарнякевіч [3]–[4].

У польскай гістарыяграфіі дзейнасцю памешчыкаў і арганізацыяй іх гаспадарання ў 1921–1939 гг. найперш за ўсё займаўся Б.У. Галка, які з’яўляецца аўтарам грунтоўнага даследавання, у якім прывёў падрабязныя звесткі наконт сацыяльнай структуры памешчыкаў Палесся і іх нацыянальнага складу, паказаў спецыфіку іх становішча [11].

У працы Я. Вацлавікавай на багатым факталагічным і крыніцавым матэрыяле (перш за ўсё на ўспамінах) разгледжаны лад жыцця памешчыкаў міжваеннай Польшчы, іх матэрыяльнае становішча і ўдзел у грамадска-палітычным жыцці, узаемаадносіны з блізкімі і сацыяльна іншымі, перш за ўсё з дворскай службай і навакольнымі сялянамі [12].

Істотнае месца памешчыцкае землеўладанне займае ў працах польскіх гісторыкаў, прысвечаных непасрэдна Палессю, якое ў параўнанні з іншымі заходнебеларускімі ваяводствамі выклікала сярод даследчыкаў найбольшую цікавасць па прычыне сваёй непаўторнасці ў сацыяльна-эканамічным і этнаграфічным плане. Сведчаннем гэтаму з'яўляюцца манаграфіі Е. Тамашэўскага [13], В. Сляшынскага [14] і П. Ціхарацкага [15], а таксама працы З. Тамчонак [16]–[17], дзе ў цэлым паказана становішча Заходняй Беларусі.

Становішча памешчыкаў у якасці асобнай сацыяльнай групы ў міжваеннай Польшчы і іх адносіны да ажыццяўлення ў краіне аграрнай рэформы сталі прадметам даследавання А. Ліхаровіча [18]. Е. Жукоўскі прааналізаваў культурна-асветніцкую дзейнасць памешчыкаў Палесся сярод мясцовага сялянства, іх стасункі і ўзаемазалежнасць [19].

Сярод крыніц, непасрэдна прысвечаных становішчу памешчыцкага гаспадарання на Палессі ў 1921–1939 гг., неабходна адзначыць спіс мясцовых памешчыкаў, падрыхтаваны да друку С. Гарчынскім і Т. Эпштэйнам з адпаведнымі каментарыямі і заўвагамі [20]. Вялікую навуковую цікавасць прадстаўляе таксама і выдадзены польскімі навукоўцамі фотаальбом, прысвечаны памешчыкам міжваеннага перыяду, дзякуючы якому можна атрымаць комплекснае ўяўленне аб іх жыцці і асноўных напрамках дзейнасці [21].

Разам з тым неабходна падкрэсліць, што далёка не ўсе аспекты разглядаемага пытання атрымалі належнае асвятленне ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, у сувязі з чым патрабуецца яго далейшая навуковая распрацоўка і дадзены артыкул з'яўляецца спробай запоўніць гэты прабел.

**Асноўная частка.** У тагачаснай сацыяльнай структуры міжваеннай Польшчы памешчыкі займалі асобнае месца, характарызаваліся найбольш высокім дабрабытам, у сувязі з чым адчувалі сябе свайго роду асобнай кастай, вышэйшай за іншых, што часцяком выклікала ў іншых саслоўяў зайздрасць і непавагу да іх [18, s. 87], [21, s. 27]. У параўнанні з мінулымі часамі памешчыцкае саслоўе стала больш адкрытым, туды можна было ўвайсці дзякуючы набыццю асобнага маёнтка, але такія выпадкі заставаліся даволі рэдкімі.

У якасці галоўных прыкмет прыналежнасці да памешчыкаў як спецыфічнай тагачаснай сацыяльнай групы можна выдзеліць наступныя:

1. прыналежнасць да шляхетнага саслоўя, веданне асабістага радаводу і гонар за сваіх заслужаных продкаў, усведамленне сваёй нібыта цывілізатарскай місіі ў дачыненні да сялян і сябе ў якасці ўсемагутных уладароў на сваіх землях, што не магло не выклікаць антаганістычнага супрацьстаяння з палешукамі [22, с. 24], [8, с. 55], [23];

2. уладанне не менш за 50 га зямлі з асобна вылучанай сядзібай, якая якасна вырознівалася на фоне сялянскіх хат, мела ад 3 да 15 пакояў (у сярэднім – 10) і з'яўлялася яскравым сімвалам свайго дамінавання ў наваколлі [24, s. 9–10];

3. наяўнасць дворскай службы, якая звычайна набіралася з навакольных вяскоўцаў. Акрамя таго, у найбольш багатых гаспадарках кухарак і гувернантак выпісвалі з-за мяжы (перш за ўсё з Францыі і Італіі);

4. актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці рэгіёна праз дзейнасць шматлікіх грамадскіх і сацыяльна-эканамічных арганізацый, мэтай якіх было далейшае злучэнне памешчыкаў у якасці адзінай сацыяльнай групы. Разам з тым ва ўспамінах некаторых памешчыкаў адзначаецца, што пасяджэнні такіх арганізацый звычайна надоўга зацягваліся і толькі адрывалі ад асабістых гаспадарчых спраў [21, s. 11–12].

Памешчыкі былі ў пераважнай большасці палякамі і таму разглядаліся ўладамі як апора сацыяльна-эканамічнага панавання на вёсцы, у сувязі з чым карысталіся істотнай дапамогай з боку ўрада, перш за ўсё ільготнымі банкаўскімі крэдытамі [22, с. 124], [14, s. 131]. Разам з тым у тагачасным грамадстве ў адносінах да памешчыкаў неаднаразова выказваліся надзвычай крытычныя заўвагі, што тыя ў першую чаргу займаюцца марнай тратай грошай (наведваннем замежных дзяржаў, закупкай прадметаў шыку, перш за ўсё легкавых аўтамабіляў), на той час як, згодна з меркаваннямі сучаснікаў, ім належала прыкладаць істотна большыя намаганні па паланізацыі мясцовага насельніцтва дзеля замацавання гэтых зямель пад польскай уладай [11, s. 46], [19, s. 153–154].

Па свайму эканамічнаму стану палескія памешчыкі былі далёка неаднароднымі (перш за ўсё па памеру землеўладання і маёмаснаму становішчу) і ў цэлым іх можна падзяліць на наступныя асноўныя групы:

1. арыстакратыя (галоўным чынам Радзівілы і Скірмунты), найбольш багатыя і ўплывовыя (не менш 1 000 га землеўладанняў), цесна звязаныя з замежнымі дзяржавамі і іх элітамі, але пры гэтым падкрэслена прывязаныя да сваёй зямлі, у сувязі з гэтым напрыклад сяляне Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў звычайна называлі сваіх памешчыкаў не проста панамі, а «князямі». У азначаных гаспадарках заўсёды меўся прасторны і багата аздоблены сядзібны дом з мноствам хатняй прыслугі і гувернантак для выхавання і адукацыі дзяцей, акрамя таго часцяком меліся летняя і зімовая рэзідэнцыі з вялікай колькасцю заўсёды гатовых да выезду пародзістых коней, а потым нават і легкавыя аўтамабілі. Прадстаўнікі гэтай групы часта ажыццяўлялі паездкі за мяжу для лячэння, дзелавых візітаў, адпачынку, наведвання родных і гэтак далей. Многія з арыстакратаў пераважна пражывалі ў гарадах заходняй і цэнтральнай Польшчы, таму арганізацыяй гаспадарання ў палескіх маёнтках займаўся кваліфікаваны кіруючы персанал, перш за ўсё аканом, які і ўвасабляў у вачах сялян памешчыцкую ўладу [7, с. 23], [25, s. 7];

2. памешчыкі сярэдняй рукі (ад 100 да 1 000 га) характарызаваліся адданасцю традыцыйным каштоўнасцям, перш за ўсё вернасцю традыцыям і захаванню ўсяго ў нязменным стане. Прадстаўнікі азначанай групы маглі задаволіць свае асноўныя сямейныя патрэбы, але без празмернага шыку, як кажуць «сціпла і з густам», у сувязі з чым у многіх гаспадарках такога роду з надзеяй на далейшае іх пашырэнне землеўласнікі намагаліся прыстасаваць свае маёнткі да рознага роду навінак, альбо з меншага спрабавалі гэта зрабіць, укладалі істотныя сродкі ў мадэрнізацыю гаспадарання, не маючы магчымасці адразу набыць дадатковай зямлі [11, s. 68], [12, s. 26];

3. адносна небагатыя памешчыцкія сем'і (да 100 га) ставілі перад сабою за мэту проста выжыванне ва ўмовах цывілізацыйных перамен і праблем, якія ў сувязі з гэтым узнікалі. З-за некаторага недахопу сродкаў азначаныя гаспадаркі звычайна эканомілі на дворскай службе і таму ўсе асноўныя гаспадарчыя пытанні вырашаў сам пан асабіста. Вялікую ўвагу пры гэтым памешчыкі надавалі выхаванню дзяцей, якія ў выніку, дзякуючы атрыманай адукацыі і падрыхтоўцы, маглі б у будучыні займацца разумовай дзейнасцю незалежна ад ступені ўладання зямлёю. З-за адсутнасці фінансавай магчымасці наняць гувернантак і хатніх настаўніц адукацыяй дзяцей займалася непасрэдна гаспадыня маёнтка. Галоўная ўвага пры гэтым надавалася агульнай агратэхічнай падрыхтоўцы, эканамічным і прававым ведам, напрыклад, у памешчыцкіх дзяцей звычайна меўся свой маленькі агародзік, дзе яны маглі практыкавацца ў вырошчванні гародніны [10, с. 62], [12, s. 51].

Сустракаліся і надзвычай непрыемныя выпадкі пераацэнкі памешчыкамі ўласнага багацця, якія межавалі з асабістай амаральнасцю і безгаспадарлівасцю. Так, адзін з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў міжваеннага польскага грамадства Ю. Жарноўскі распавядаў пра аднаго «барона», які напрыклад не мог сабе дазволіць нават наведванне Варшавы і адрозніваўся ад сваіх навакольных суседзяў-сялян толькі тым, што выпісваў газету. Пры гэтым свой невялікі маёнтак той ацаніў у 1 000 000 злотых, але па з'едлівых заўвагах суразмоўцы ніхто яму такой сумы ніколі ў жыцці не заплаціў бы! [19, s. 153].

Паводле матэрыялаў агульнадзяржаўнага сельскагаспадарчага перапісу ад 30 верасня 1921 г. у Палескім ваяводстве налічвалася 856 маёнткаў плошчай больш за 50 га (з іх больш за 100 га – 698, 20 % ад усёй міжваеннай Польшчы, больш за 1 000 га – 246), якія ахаплівалі 146 985 га [11, s. 67–71]. На іншым баку знаходзілася каля 480 000 сялянскіх гаспадарак (больш за 99 % сельскагаспадарчага насельніцтва ваяводства), якія валодалі толькі 3 300 000 га (42 %) ворнай зямлі, прычым 8 250 сялян-палешукоў мелі ў сярэднім па 0,5 га, а каля 20 % сялян былі зусім беззямельнымі. Падобнай празмернай канцэнтрацыі зямельнай уласнасці не назіралася больш ні ў адным тагачасным еўрапейскім рэгіёне, што надзвычай абвастрала аграрнае пытанне, якое цесна перапляталася тут з нацыянальным і таму патрабавала тэрміновага вырашэння. Акрамя таго, многія палітычныя сілы ва ўмовах усеагульнага ўздыму пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. актыўна выступалі за перадачу памешчыцкіх зямель на карысць сялян [7, с. 24–25].

На 1921 г. на Палессі налічвалася 773 памешчыкі (0,76 % землеўладальнікаў), ва ўласнасці якіх знаходзілася не менш чым па 100 га, агульная плошча іх уладанняў складала 1 256 553 га (61,91 %). Найбольшая канцэнтрацыя буйной землеўласнасці назіралася ў Лунінецкім (80,2 %), Косаўскім (71,8 %) і Пінскім (62,7 %) паветах [2, с. 108]. Асноўныя звесткі адносна памешчыцкага землеўладання прадстаўлены ў наступнай табліцы [6, с. 191]:

| Памер, у га | Гаспадарак | Палякі | | Беларусы | | Іншыя | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Гаспадарак | % | Гаспадарак | % | Гаспадарак | % |
| 50–100 | 180 | 88 | 49,0 | 71 | 39,4 | 21 | 11,6 |
| 100–500 | 318 | 227 | 71,4 | 50 | 18,9 | 41 | 9,7 |
| 500–1000 | 107 | 74 | 69,1 | 14 | 13,1 | 19 | 17,8 |
| Звыш 1 000 | 246 | 166 | 67,5 | 17 | 6,9 | 63 | 25,6 |
| Усяго | 851 | 555 | 65,2 | 152 | 17,9 | 144 | 16,9 |

У нацыянальным плане структура памешчыцкага землеўладання на Палессі на 1921 г. выглядала наступным чынам [20, s. 5]:

| Нацыянальнасць | Колькасць маёнткаў | % | Плошча, тысяч га | % |
|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 152 | 17,9 | 74,2 | 4,6 |
| Палякі | 555 | 65,2 | 1 093,2 | 67,4 |
| Рускія | 79 | 9,3 | 312,6 | 19,3 |
| Украінцы | 39 | 4,6 | 73,7 | 4,5 |
| Яўрэі | 19 | 2,0 | 51,1 | 3,1 |
| Іншыя | 9 | 1,0 | 17,0 | 1,0 |
| Разам | 851 | 100 | 1 621,8 | 100 |

На 1921 г. у Палескім ваяводстве налічвалася 202 памешчыцкія латыфундыі абшарам 1 142 000 га, што складала палову ад усіх заходнебеларускіх. Яскравым паказчыкам дыспрапорцыі зямельнага карыстання на Палессі на пачатку 1920-х гг. з’яўляецца той факт, што 16 найбольш буйных памешчыцкіх гаспадарак ахоплівалі прыкладна такі ж абшар зямлі, як 101 500 сялянскіх гаспадарак памерам да 20 га сумесна [7, с. 23–24].

На пачатак 1920-х гг. на Палессі памешчыцкія гаспадаркі абшарам больш за 100 га займалі 49,4 % землекарыстання (з іх лясы складалі 48,8 %, лугі 19,8 %, неўжыткі 24,1 %, ворная зямля 7,3 %), сярэдні памер маёнтка складаў 3 076 га [15, s. 130]. Найбольш распаўсюджанымі на 1924 г. у памешчыцкім землеўладанні на Палессі былі грунты IV класа, якія абкладаліся зямельным падаткам у памеры 2,10 злотых з га, што было на той час самым нізкім паказчыкам па ўсёй Польшчы. Таму кошт палескай зямлі істотна саступаў нават суседняй Валыні – напрыклад, у 1928 г. 1 га найлепшай зямлі (пшанічна-бураковай) каштаваў тут усяго 1 020 злотых, у той час як у Валынскім ваяводстве ўдвая даражэй (2 160 злотых) [14, s. 133], [17, s. 112]. Акрамя таго, зямельны падатак у Палескім ваяводстве быў самым нізкім у тагачаснай Польшчы [15, s. 58]. Аб памеры памешчыцкіх маёнткаў на Палессі і іх падаткаабкладанні на 1921 г. сведчыць наступная табліца [11, s. 78, 89]:

| Памер, у га | Колькасць | Агульная плошча, у га | У сярэднім на маёнтак, га | Падатак з 1 га, у злотых | Падатак з 1 маёнтка, у злотых |
|---|---|---|---|---|---|
| Усяго | 856 | 476 158 | 556 | – | – |
| 50–100 | 180 | 8 752 | 48 | 7,17 | 344,1 |
| 100–200 | 142 | 14 117 | 99 | 10,81 | 1 077,1 |
| 200–300 | 81 | 12 915 | 159 | 13,43 | 2 135,3 |
| 300–400 | 55 | 12 525 | 227 | 14,03 | 3 184,8 |
| 400–500 | 41 | 12 064 | 294 | 14,03 | 4 124,8 |
| 500–100 | 107 | 43 573 | 407 | 15,72 | 639,0 |
| > 1 000 | 250 | 372 212 | 1 488 | 19,38 | 28 837,4 |

Паводле звестак наступнага ўсепольскага перапісу 1931 г. на Палессі налічвалася 968 гаспадарак больш за 100 га (з іх 202 абшарам больш за 1 000 і 16 больш за 10 000 га). У большасці выпадкаў яны знаходзіліся на багніста-лясістай частцы Палесся, таму калі вялікія гас-

падаркі плошчай больш 50 га на 1937 г. ахоплівалі 38,6 % усяго рэгіёна, то ў адносінах да ворнай зямлі гэты паказчык складаў 22 % [14, s. 132–133]. Паводле звестак В.М. Папко на 1931 г. у Палескім ваяводстве памешчыкам належала 38,6 % сельскагаспадарчых зямель (другое месца пасля Познаньскага ваяводства, дзе гэты паказчык складаў 41,6 %), на той час як дробныя гаспадаркі ахоплівалі 42,5 % [9, с. 118]. Сітуацыя з памешчыцкім землеўладаннем Палесся ў параўнанні з суседнімі ваяводствамі і сярэднімі паказчыкамі па Польшчы на 1931 г. выглядала наступным чынам (у %) [16, s. 27]:

| Ваяводства | Гаспадаркі да 50 га | | Гаспадаркі звыш 50 га | | % насельніцтва |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ад агульнай плошчы землекарыстання | Ворныя землі | Ад агульнай плошчы землекарыстання | Ворныя землі | |
| Польшча | 57,6 | 80,3 | 25,8 | 17,3 | 0,5 |
| Віленскае | 57,9 | 81,6 | 28,3 | 16,6 | 0,8 |
| Навагрудскае | 57,9 | 84,6 | 27,2 | 13,9 | 0,5 |
| **Палескае** | **42,5** | **85,7** | **38,6** | **11,8** | **0,3** |

У цэлым на Палессі памешчыцкія маёнткі былі як правіла больш вялікімі па плошчы, але пры гэтым доля ворных зямель заставалася меншай з-за агульнай забагненасці [1, с. 75]. Паводле звестак на 1939 г. сярэдні памер маёнтка ў Польшчы складаў 522 га, у той час як на Палессі аж 2 121 га [2, с. 110]. У параўнанні з памешчыцкімі гаспадаркамі ў іншых ваяводствах тагачаснай Польшчы асноўную долю землеўладанняў тут складалі не ворныя землі, а лес, які ўвесь час заставаўся надзвычай запатрабаваным таварам і крыніцай асноўнага багацця памешчыкаў [13, s. 103], [17, s. 112].

**Заключэнне.** Памешчыкі адыгрывалі ў 1921–1939 гг. у сельскай гаспадарцы Палескага ваяводства вырашальную ролю, іх маёнткі дзякуючы цяжкай працы навакольнага сялянства з'яўляліся галоўнымі вытворчымі цэнтрамі. Разам з тым сацыяльны склад памешчыкаў не быў аднародным, у залежнасці ад ступені землеўладання выдзяляліся тры іх асноўныя групы (да 100 га, 100–1 000 га, больш 1 000 га), якія даволі рэзка адрозніваліся грамадскім уплывам, адносінамі да жыцця, выхавання дзяцей і ўзаемасувязямі з навакольным сялянствам. У параўнанні з землямі памешчыкаў суседніх ваяводстваў на Палессі ворныя землі былі істотна горшай якасці, што сур'ёзна зніжала агульны матэрыяльны дабрабыт мясцовых землеўласнікаў.

## Літаратура

1. Гольдштейн, И. И. Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии / И. И. Гольдштейн. – М. : Соцэгиз, 1940. – 296 с.

2. Сильванович, С. А. Планы и реальность польской политики на Полесье в 1921–1939 гг. / С. А. Сильванович // Устойчивое развитие экономики: состояние, проблемы, перспективы : матер. IV Междунар. научно-практ. конф., Пинск, 20–22 мая 2010 г. : в 2 ч. / ПолесГУ ; редкол.: К. К. Шебеко (гл. ред.) [и др.] – Пинск, 2010. – Ч. 2. – С. 108–110.

3. Цымбал, А. Г. Палессе ў палітыцы польскіх улад (1921–1939) у адлюстраванні польскай гістарыяграфіі / А. Г. Цымбал // Беларусь і Германія : гісторыя і сучаснасць. – Мінск. : МДЛУ, 2018. – Вып. 16. – С. 63–68.

4. Чарнякевіч, І. С. Палессе ў навуковай і грамадскай думцы ў міжваенны перыяд / І. С. Чарнякевіч // Беларусь і суседзі : шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнац. і міждзярж. адносіны : зб. нав. артыкулаў. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2014. – Вып. 3. – С. 140–144.

5. Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – 334 с.

6. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 199 с.

7. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск : Вышэйшая школа, 1975. – 110 с.

8. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И. В. Полуян. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 205 с.

9. Папко, В. М. Род Дзяконскіх і іх маёнткі на Брэстчыне ў XIX–XX стст. / В. М. Папко. – Брэст : Альтернатива, 2011. – 245 с.

10. Мисиюк, В. С. Крупные землевладельцы Западной Белоруссии в контексте общественной трансформации (1921–1939) / В. С. Мисиюк // Системная трансформация общества : сб. науч. трудов каф. соц.-гум. наук. – Брест : БрГТУ, 2015. – С. 62–66.
11. Galka, B. W. Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918–1939 / B. W. Galka. – Toruń : Adam Marszalek, 1999. – 214 s.
12. Waclawikova, J. Literacki obraz ziemiaństwa polskiego w wybranej literaturze pamiętnikarskiej / J. Waclawikova. – Olomouc, 2016. – S. 1–93.
13. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia, 1921–1939 : zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : Państ. Wydaw. Nauk., 1963. – 208 s.
14. Śleszyński, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 335 s.
15. Cichoracki, P. Województwo Poleskie 1921–1939. Z dziejów politycznych / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW ; Wrocław : IH Uniw. Wrocławskiego, 2014. – 477 s.
16. Tomczonek, Z. Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. – Białystok : Wydaw. Politech. Białostockiej, 1996. – 247 s.
17. Tomczonek, Z. Wies poleska 1918–1939 / Z. Tomczonek // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёну Беларусі : матэр. Міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 23–24 красавіка 1998 г. : у 2 ч. ; навук. рэд.: С. В. Арцёменка [і інш.]. – Брэст, 1998. – Ч. 2. – С. 110–115.
18. Lichorowicz, A. Polskie reformy rolne 1920–1944 a ziemiaństwo / A. Lichorowicz // Dziedzictwo : ziemianie polscy i udział ich w życiu narodu. – Kraków : Znak, 1996. – S. 85–97.
19. Żarnowski, J. Społeczeństwo Polski międzywojennej / J. Żarnowski. – Warszawa : Wiedza Powszechna, 1969. – 173 s.
20. Spis ziemian Rzeczypospolitej Polskiej w roku 1930 : Województwo Poleskie. Województwo Wołynskie / Oprac.: T. Epsztein, Sl. Gorzynski. – Warszawa : DiG, 1996. – 76 s.
21. Ziemianie : pomiędzy rzeczywistością a wspomnieniem / wstęp: T. Chrzanowski. – Kraków : Znak, 1998. – 183 s.
22. Вабішчэвіч, М. А. Спецыфіка становішча палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / А. М. Вабішчэвіч // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2008. – № 4 (49). – С. 124–131.
23. Żukowski, J. Kulturotwórcza rola ziemiaństwa poleskiego II Rzeczypospolitej [Zasoby elektroniczne] / J. Żukowski. – Tryb dostępu : https://www.cbr.gov.pl/images/pdf/XIV_fnr/referaty/Zukowski-Polesie.pdf. – Data dostępu : 17.11.2022.
24. Wasilewski, H. Czar mojego Polesia: wspomnienia o Kresach Wschodnich : zabytki, cmentarze, leśne i przydrożne mogiły to świadectwa polskiej historii Polesia / H. Wasilewski. – Wrocław : NORTOM, 2007. – 55 s.
25. Piekarski, T. Przejawy życia codziennego ziemian Mazowsza Płockiego w okresie międzywojennym / T. Piekarski // Notatki Płockie. – 2012. – № 3. – S. 7–13.

Институт истории НАН Беларуси
Поступила в редакцию 16.12.2022